Трэці этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах
«Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» 2020/2021 навучальны год

ТРЭЦІ ЭТАП XXXVII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2021 г.*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**9 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.**

| Нумар паштоўкі | Апісанне свята | Марфемны разбор вылучанага слова |
|---|---|---|
| 3 | Другая назва – Зялёныя святкі. Гэта свята жаночае, святкавалася строга калі зазелянеюць бяроза, ліпа ды іншыя “жаночыя” дрэвы. Да гэтага часу адгулялі сваё русалкі, ***ахоўніцы*** жыта, каго хацелі – заласкаталі, і цяпер дзяўчаты з песнямі праводзяць іх у іншы свет (так-так, нашы русалачкі ходзяць на дзвюх нагах – не блытаць з дыснэеўскімі!). Яшчэ дзяўчаты плятуць вянкі з бярозак ды водзяць карагоды. Бярозавымі венікамі мялі могілкі. Але галоўнае – у гэты дзень кумаваліся, што раім рабіць і цяпер: праходзіць у лесе пад аркаю з бярозак і станавіцца “сёстрамі на год”. | ахоў-н-іц-ы |
| 4 | Раней гэты яўна было галоўнае свята. Чаму? А навошта перад негалоўным хату начыста мыць?! ***Абуджэнне*** прыроды, зноў жа, дні пабольшалі. Добры пачатак!<br>На гэтае свята валачобнікі хадзілі – але толькі мужчыны, якія спявалі пад вокнамі асаблівыя песні: абавязкова пазітыўныя і вельмі доўгія ды эпічныя! | а-будж-энн-е |
| 2 | Час ад Раства і аж да самага Вадохрышча. А яшчэ – прыгатаваны да свята парсючок… Посная Куцця – у ноч перад Раством, пасля першай зоркі. На стале 12 страў – па ліку апосталаў. А пад абрусам – сена. Адразу папярэджваем: у горадзе з пастаўкамі сена могуць быць ***перабоі***, варта рыхтавацца загадзя.<br>Праз сем дзён – Шчодрая куцця. Вось тады на стале пачастунак, а на дамафоне госці. А дзяўчаткі ў гэтыя дні варожаць. Можна традыцыйна, а можна і па-сучаснаму, на тым жа гугле. | пера-бо(й)-і |

*За кожнае правільна вызначанае свята – 1 бал, за кожны правільны разбор – 1 бал.*

**Заданне 2.**

А) без нічога ніякага
Б) не чуць ні рук ні ног
В) на тое і сабака, каб зайца ганяць
Г) з адной краскі вянок не саўеш
Д) верзці грушы на вярбе
Е) пусціцца наўцёкі

*За кожную правільна падабраную пару – 0,5 бала, за кожнае правільнае напісанне слоў, дзе трэба было раскрыць дужкі ці ўставіць літару, – 0,5 бала.*

**Заданне 3.**

| № | Прыкладнае тлумачэнне |
|---|---|
| 1. | Чацвёртае лішняе: *басаножка – басаножкі*. Толькі ў гэтай пары назоўнікаў правільна ўтворана форма множнага ліку. Ва ўсіх астатніх выпадках дапушчаны памылкі. Правільна: *ба'цька – ба'цькі, вясло – вёслы*, а зборны назоўнік *крылле* наогул не ўтварае формы множнага ліку. |
| 2. | Чацвёртае лішняе – *рэвю*, паколькі гэта назоўнік ніякага роду, а ўсе астатнія назоўнікі мужчынскага роду. |
| 3. | Чацвёртае лішняе: *абсалютна спакойны* трэба пісаць асобна, паколькі паміж словамі захоўваецца падпарадкавальная сувязь *(спакойны* наколькі? У якой меры? – *абсалютна)*. Усе астатнія прыметнікі напісаны правільна. |
| 4. | Чацвёртае лішняе: *паўтары тыдні*. Правільна *паўтара тыдня*, бо лічэбнік *паўтары* ўжываецца з назоўнікамі жаночага роду, а *паўтара* – з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду, а пры дробавых лічэбніках назоўнікі ставяцца ў форме роднага склону адзіночнага ліку. Усе астатнія словазлучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі пабудаваны правільна. |
| 5. | Чацвёртае лішняе: *выпале грады* (напісанне граматычнай формы дзеяслова адпавядае норме). У астатніх граматычных формах дзеясловаў дапушчаны памылкі. Трэба *запляцём* (у загадным ладзе – *запляцем), перадасце* (рознаспрагальны дзеяслоў), *зберажацé* (І спражэнне: *мы зберажом – вы зберажацé*). |
| 6. | Чацвёртае лішняе: *пабольшаўшы – пабольшыць*. Гэта формы розных дзеясловаў (правільна: *пабольшаўшы – пабольшаць*). Ва ўсіх астатніх выпадках прыведзены формы аднолькавых дзеясловаў. |

*За кожнае правільна вызначанае чацвёртае – 0,5 бала, за кожнае правільнае тлумачэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| № | Суфіксы | Магчымыя прыклады |
|---|---|---|
| 1. | -анк(а)/-янк(а) | *грачанка, кітаянка, турчанка, служанка…* |
| 2. | -чыц(а)/-шчыц(а) | *выкладчыца, газетчыца, буфетчыца, прыёмшчыца…* |
| 3. | -іх(а)/-ых(а) | *старшыніха, краўчыха, паварыха, ткачыха, камандзірыха…* |
| 4. | -ін(я)/-ын(я) | *графіня, герцагіня, княгіня, рабыня, багіня…* |
| 5. | -ніц(а) | *асветніца, ахоўніца, настаўніца, дачніца…* |
| 6. | -ш(а) | *касірша, генеральша, кандуктарша, доктарша...* |

*За кожны правільна падабраны прыклад – 0,5 бала.*

**Заданне 5.** А1Б3В7Г5Д3Е2.

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| № | Выпраўлены варыянт | Тлумачэнне |
|---|---|---|
| 1. | Значэнне Беларускай АЭС для энергетычнай бяспекі і ў цэлым эканомікі нашай краіны проста велізарнае. | *Забеспячэння бяспекі* – таўталогія. |
| 2. | Са 160 пастаянных кліентаў фітнес-клуба купляць абанемент на красавік пагадзілася толькі 10 працэнтаў. | *Красавік месяц* – плеаназм. |
| 3. | Пакуль на вытворчым участку створана 73 рабочыя месцы, але ёсць добрыя перспектывы. | *Перспектывы* – гэта тое, што ёсць у будучым, г. зн. наперадзе, таму *наперадзе будучыя перспектывы* – гэта плеаназм. |
| 4. | Устаноўлена, што ў сем’ях, у якіх бацькі аддаюць (адводзяць) шмат часу на размовы, гульні з дзецьмі, дзеці лепш развіваюцца. | *Марнаваць* – значыць траціць без карысці, што абсалютна супярэчыць зместу сказа; памылка звязана з няправільнай семантычнай спалучальнасцю. |
| 5. | | Няма памылкі. |
| 6. | Прыярытэт (або галоўная перавага) на свяце застанецца, вядома, за мясцовым кулінарным брэндам – хатнімі сырамі. | *Прыярытэт* – гэта галоўная перавага, таму *галоўны прыярытэт* – плеаназм. |

*За кожны правільна запоўнены радок – 1 бал (па 0,5 бала за выпраўлены варыянт і за тлумачэнне). У пазіцыі 5 удзельнік алімпіяды, які напісаў у слупку “Тлумачэнне” “няма памылкі”, атрымлівае 1 бал.*

**Заданне 7.**

У канцы XVI – XVIII стагоддзяў горад Нясвіж уяўляў сабой дынамічны адміністратыўны, гандлёвы, культурны і рэлігійны цэнтр, уплыў якога распаўсюджваўся амаль на ўсю тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага. Дзякуючы (з прычыны) актыўнаму ўзаемадзеянню на этнічным і міжнародным узроўнях у Нясвіжы тады стваралася тая спадчына, якая (што) сёння стала не толькі агульнабеларускай, але і агульнаеўрапейскай каштоўнасцю.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

**Санет:** толькі 14 радкоў; бывае французскім і італьянскім; часцей чатыры страфы (два катрэны і два тэрцэты); можа складацца ў вянкі і вянкі вянкоў.

**Трыялет:** толькі 8 радкоў; мае толькі дзве рыфмы, тройчы паўтараецца першы радок; двойчы паўтараецца другі радок.

**Ода:** адлюстроўвае важныя падзеі; урачыстасць; пахвала асобе; прысвячаецца падзеі або герою.

**Элегія:** смутак; меланхолія; журба; паказваецца несправядлівасць, сямейнае або грамадскае гора.

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| **Твор** | **Аўтар** |
|---|---|
| «Ганарысты парсюк» | Кандрат Крапіва |
| «Жураўліны крык» | Васіль Быкаў |
| «Жывая вада» | Якуб Колас |
| «Маёвая песня» | Максім Багдановіч |
| «Роднае слова» | Данута Бічэль |
| «Сармацкае кадзіла» | Пімен Панчанка |

*За кожны правільна названы твор – 0,5 бала, за правільна вызначанага аўтара – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*За кожны правільна падабраны верш і яго аўтара – 0,5 бала.*

Пры ацэнцы анатацыі неабходна ўлічваць два параметры: вытрыманасць анатацыі азначэнню і творчы характар.

*За адпаведнасць патрабаванням да анатацыі – 1 бал, за крэатыўнасць – 1 бал.*

*Крытэрыі крэатыўнасці: арыгінальнасць, стварэнне прынцыпова новай ідэі, якая адхіляецца ад традыцыйных або агульнапрынятых схем мыслення.*